**Зайцава, Л.** Рыхтаваў МІГі для баявых вылетаў / Л. Зайцава // Герой працы (Шуміліна). — 2004. — 13 лют. — С. 2.

# РЫХТАВАЎ МІГІ ДЛЯ БАЯВЫХ ВЫЛЕТАЎ



Кажуць, што вайна азлоблівае чалавека на ўсё жыццё, робіць яго больш жорсткім, самотным і маўклівым. Але мой суразмоўца – ***Сяргей Уладзіміравіч Храмцоў*** – аказаўся надзіва гаваркім. Ён зусім не падобны на неўраўнаважанага і нервовага чалавека, хоць, як шчыра ён прызнаўся, успаміны пра вайну ў Афганістане вярэдзяць душу і сёння. Для яго (як, напэўна, і для ўсіх афганцаў) дзень 15 лютага – асаблівы. Гэта дзень успамінаў, дзень памяці пра тых, каго няма ў жывых...

Як трапіў у Афганістан? Быў ваеннаслужачым – пасля заканчэння Калінінградскага ваеннага авіяцыйна-тэхнічнага вучылішча карэнны обальскі хлопец па размеркаванню трапіў у пасёлак Какайды Туркестанскай ваеннай акругі. Служыў ля горада Тэрмеза ў знішчальна-авіяцыйным палку, які ў снежні 1979 года быў перакінуты на аэрадром Баграм – у Афганістан. Напружаная атмасфера адчувалася тут не тое што кожны дзень – кожную хвіліну; заўсёды трэба было быць напагатове.

Праз некаторы час полк быў перакінуты ў самую паўднёвую кропку – Кандагар, што за паўсотню кіламетраў ад пакістанскай граніцы. Непасрэднай задачай С. У. Храмцова як інжынера-тэхніка была падрыхтоўка МІГ-21 да баявых узлётаў. Сам не лятаў, але поўнасцю адказваў за падрытоўку тэхнікі – ад гэтага часта залежыла жыццё таварышаў (а дакладней, дзвюх эскадрылляў, якія налічвалі ў агульнай колькасці 30 самалётаў). Полк быў мнoганацыянальны: сярод трохсот чалавек былі і беларусы, і ўкраінцы, і ўзбекі... Усе сябравалі, і да слёз было шкада, калі нехта вяртаўся з задання цяжкапаранены, было невыносна балюча, калі нехта зусім не вяртаўся. Здаралася і такое, што машына з кулявымі прабоінамі далятала назад, у Кандагар, не рассыпалася прама ў паветры толькі дзякуючы сваёй «жывучасці» і якаснаму рамонту.

Былі і другарадныя цяжкасці, асноўныя з якіх – хваробы, а таксама гарачыня, якая дасягала 50 градусаў. Да самалёта – не дакрануцца. Летам, здаецца, задыхаешся ад гарачыні і пылу, ад ветру з незвычайнай назвай «афганец».

Пасля Кандагара С. У. Храмцоў яшчэ пяць гадоў служыў у Венгрыі, затым у г. Бяроза Брэсцкай вобласці. Пасля службы маёр запасу вярнуўся ў родны раён. Зараз жыве і працуе ў Шуміліне.

Сёлета Сяргея Уладзіміравіча запрашалі ў Мінск на з'езд афганцаў, але з-за хваробы паехаць ён не змог, аб чым вельмі шкадуе. Тым не менш, С. У. Храмцоў ніколі не забывае пра былое братэрства ў Афганістане, пра таварышаў, з якімі яго з'яднала вайна.

**Л. Зайцава**